Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу"
Серыя

№ 5 (59) ' 2007

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

**М. І. МІНІЦКІ — галоўны рэдактар,** *кандыдат гістарычных навук*

**У. В. ТУГАЙ — першы намеснік галоўнага рэдактара,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар**
**І. І. БАГДАНОВІЧ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. М. ХОДЗІН,** *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ШУТАВА,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. У. ЖЭРКА**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА**

**У. В. ТУГАЙ — старшыня**
**М. М. ЗАБАЎСКІ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА,** *доктар педагагічных навук*
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН,** *доктар педагагічных навук, прафесар*



**Заснавальнік і выдавец —**
**РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

220070, г. Мінск, вул. Будзённага, 21; тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу), факс: 297-91-49
e-mail: aiv@aiv.by, http://www.aiv.by

# З юбілеем!



## Віталю Міхайлавічу ФАМІНУ — 80!

Віталь Міхайлавіч Фамін нарадзіўся 20 мая 1927 г. у вёсцы [illegible] Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. З ранняга дзяцінства ён спазнаў усе цяжкасці вясковага жыцця. Бацькі прывілі яму тыя чалавечыя якасці, якія дазволілі стаць сапраўдным Чалавекам.

У школе ён праяўляў руплівасць у вучобе, набыцці ведаў. Асабліва цікавіла юнака гісторыя. Пасля была вайна і жыццё на акупіраванай тэрыторыі. У 1944 г. пасля вызвалення Гомельшчыны ад нямецкіх захопнікаў В. М. Фамін прызваны ў рады Савецкай Арміі. Службу праходзіў у пагранічных войсках. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам і медалямі Савецкага Саюза і Рэспублікі Беларусь, ганаровымі званнямі і знакамі.

У 1953 г. звольніўся ў запас і прысвяціў сваё жыццё служэнню гістарычнай навуцы і педагагічнай дзейнасці. Пасля заканчэння гісторыка-філалагічнага факультэта МДПІ імя Максіма Горкага працаваў на розных дзяржаўных пасадах. У 1963 г. закончыў аспірантуру па спецыяльнасці «Айчынная гісторыя», абараніў кандыдацкую дысертацыю і працаваў на кафедры гісторыі СССР старшым выкладчыкам, дацэнтам. Паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю. Прафесар. З 1972 па 1997 г. В. М. Фамін займаў пасаду загадчыка кафедры гісторыі СССР, а пасля яе перайменавання — славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі.

Віталь Міхайлавіч — вядомы ў краіне і за яе межамі вучоны. Сфера навуковых інтарэсаў — актуальныя праблемы гісторыі Беларусі і Расіі XIX–XX стст. Пад яго навуковым кіраўніцтвам абаронены 2 доктарскія і звыш 30 кандыдацкіх дысертацый. Сёння можна ўпэўнена сцвярджаць, што ў Рэспубліцы Беларусь склалася навуковая школа В. М. Фаміна. Асабіста вучоны выдаў шэраг манаграфій, сотні навуковых артыкулаў, напісаў падручнікі для сярэдняй агульнаадукацыйнай і вышэйшай школы па гісторыі Беларусі. Арганізатар і ўдзельнік шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый.

Віталь Міхайлавіч мае багаты навукова-практычны вопыт. Курс лекцый В. М. Фаміна з вялікім задавальненнем слухаюць студэнты і маладыя выкладчыкі. Нестандартнасць, навізна, новыя метадалагічныя падыходы — якасныя рысы педагога-навукоўца.

Студэнты і выкладчыкі гістарычнага факультэта, сябры сардэчна віншуюць удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, вучонага, педагога, Чалавека з 80-годдзем з дня нараджэння.